Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

За сталінскія КАДРЫ

Орган партбюро, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 9 (222) | Субота, 23 красавіка 1955 года | Цана 20 кап.

Няхай жыве Комуністычная партыя Совецкага Саюза—вялікая натхняючая і кіруючая сіла совецкага народа ў барацьбе за пабудову комунізма!

Пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна, пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі — уперад, да перамогі комунізма!



ГЕНІЙ ЧАЛАВЕЦТВА

Дваццаць другога красавіка споўнілася 85 год з дня нараджэння Владзіміра Ільіча Леніна—геніяльнага мысліцеля, заснавальніка Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы, правадыра і настаўніка працоўных усяго свету.

«Ніколі яшчэ пасля Маркса,—гаварылася ў Звароце Цэнтральнага Камітэта да партыі і працоўных 22 студзеня 1924 года,—гісторыя вялікага вызваленчага руху пралетарыята не вылучала такой гіганцкай фігуры, як наш нябожчык правадыр, настаўнік, друг. Усё, што ёсць у пролетарыяце сапраўды вялікага і гераічнага,—бясстрашны розум, жалезная, незгінаемая, упорная, усё перамагаючая воля, свяшчэнная нянавісць, нянавісць да смерці к рабству і прыгнечанню, рэволюцыйная страсць, якая рухае гарамі, бязмежная вера ў творчыя сілы мас, велізарны арганізацыйны геній,—усё гэта знайшло сваё выдатнае ўвасабленне ў Леніне, імя якога стала сімвалам новага свету ад захаду да ўсходу, ад поўдня да поўначы».

В. І. Ленін—геніяльны тэарэтык марксізма і вялікі арганізатар мас. У жорсткай барацьбе з ворагамі ён не толькі адстаяў, але творча развіў і абагаціў яго новымі палажэннямі аб законах класавай барацьбы, стварыў цэласнае вучэнне аб дыктатуры пролетарыята, аб Комуністычнай партыі, распрацаваў новую закончаную тэорыю соцыялістычнай рэволюцыі, абгрунтаваў магчымасць перамогі соцыялізма ў адной краіне, намеціў план пабудовы соцыялістычнага грамадства ў СССР, шляхі пераходу ад соцыялізма да комунізма.

Вялікі прадаўжальнік справы Маркса—Энгельса В. І. Ленін стварыў марксісцкую партыю, партыю новага тыпу, распрацаваў яе ідэалагічныя, арганізацыйныя, тактычныя і тэарэтычныя асновы, ператварыў яе ў самую магутную рэволюцыйную партыю ў свеце, якая ўвасабляе сабой розум, гонар і сумленне нашай эпохі.

Комуністычная партыя, загартаваная ў баях пад кіраўніцтвам геніяльнага Леніна, вучня і прадаўжальніка справы Леніна І. В. Сталіна і іх саратнікаў, з'яўляецца ў сучасны момант вядучай, арганізуючай і накіроўваючай сілай совецкага народа, які ідзе па шляху да комунізма.

Імя Леніна непарыўна звязана са стварэннем і ўмацаваннем першай ў свеце соцыялістычай дзяржавы. Перамога соцыялістычнай рэволюцыі і стварэнне дзяржавы новага тыпу азначала карэнны рэволюцыйны паварот ва ўсёй сусветнай гісторыі. Закончылася эпоха безраздзельнага панавання эксплуататарскіх класаў, пачалася эпоха панавання рабочага класа, працоўных—эпоха дыктатуры пролетарыята.

Залажыўшы трывалыя асновы першай ў свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян, Ленін распрацаваў прынцып яе арганізацыі, вызначыў яе ролю ў соцыялістычным пераўтварэнні краіны. Ён распрацаваў навукова абгрунтаваную праграму пераўтварэння эканамічна-адсталай Расіі ў перадавую, магутную соцыялістычную дзяржаву. Узброеная ленінскай праграмай соцыялістычнага будаўніцтва, наша партыя выпрацавала мудрую палітыку індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, адстаяла гэтую палітыку ў жорсткай барацьбе супроць трацкістаў, бухарынцаў і іншых ворагаў народа, якія імкнуліся звярнуць партыю і краіну з ленінскага шляху, і мабілізавала мільённыя масы працоўных на яе ажыццяўленне.

За гады існавання Совецкай улады наша краіна зрабіла сапраўды гіганцкі скачок наперад, ператварылася ў вялікую, індустрыяльна-калгасную, соцыялістычную дзяржаву. У 1940 годзе аб'ём прадукцыі буйнай прамысловасці СССР у 12 разоў перавышаў узровень 1913 года, а ў сучасны момант наша буйная прамысловасць выпускае прадукцыі ў 30 з лішкам разоў больш у параўнанні з дарэволюцыйнай Расіяй. У выніку індустрыялізацыі краіны і стварэння калгаснага ладу ў СССР была забяспечана перамога соцыялізма.

В. І. Ленін вучыў, што комунізм можа наступіць толькі пасля таго, як пераможа і ўмацуецца соцыялізм. Шлях да комунізма—гэта ўсебаковае развіццё вытворчых сіл соцыялізма, памнажэнне і ўмацаванне грамадскай уласнасці, далейшы культурны рост працоўных і поўнае пераадоленне перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей. Усю сваю работу партыя накіроўвае на выкананне гэтых ленінскіх запаветаў.

Вялікі Ленін прадбачыў, што па меры поспехаў соцыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне непазбежна будзе ўмацоўвацца рост сіл соцыялізма ва ўсіх краінах. У сучасны момант, калі ўтварыўся і ўмацаваўся лагер міру, дэмакратыі і соцыялізма, гэтыя прарочыя словы Леніна пацвярджаюцца самім жыццём. Мільёны людзей у краінах народнай дэмакратыі будуюць сваё жыццё па ідэях вялікага Леніна, мільёны працоўных людзей усяго свету бачаць у гэтых ідэях сваё збаўленне ад капіталістычнага прыгнёту. Неўміручае вучэнне Леніна асвятляе ім шлях у барацьбе з прыгнятальнікамі.

Вечна жывое, усёперамагаючае вучэнне Владзіміра Ільіча Леніна натхняе совецкіх людзей на новыя працоўныя поспехі. Яно дае невычарпальныя сілы нашаму народу ў яго велічнай справе—пабудове комуністычнага грамадства.

С. ВАСИЛЬЕВ

С именем Ленина

Мирное небо в сплошных огнях,
домны,
плотины,
шоссе,
мосты—
все это ленинской воли размах,
его, воплощенные в явь, мечты.
Тысячи га осушенных болот,
песня в степи,
книга в глуши—
все это ленинских дум полет,
жар негасимой его души.
Влага в пустыне,
сады в степи,
труд, воедино сплотивший нас,—
все это звенья в одной цепи,
Ленина выполненный наказ.
Заданный им далеко вперед
мудрый завет—трудовой урок—
выполнил доблестный наш народ
в самый короткий срок.
С именем Ленина на устах
мы одолели мороз и зной,
яблони вырастили в снегах,
полюс разведали ледяной.
Дерзко раскрыли недра земли,
камнем одели рек берега...
С именем Ленина
в бой пошли
и победили
в бою врага.
С нами невидимый шел Ильич
сквозь бесконечный огонь и мрак;
его мы слышали громкий клич
в топоте, в громе ночных атак.
Мы и теперь
каждый шаг пути
точно сверяем
с его мечтой,
чтобы в сохранности донести
светоч,
зажженный его рукой,
до Коммунизма,
до тех высот,
до тех уже различимых лет,
навстречу которым идет народ
ясной дорогой своих побед.
Будем же верою в жизнь полны,
в пламень развернутых алых знамен,
будем,
как Ленин,
честны, скромны,
будем такими, каким был он!

ІДЭІ ВЯЛІКАГА ЛЕНІНА ВЯДУЦЬ НАС

★ ★ ★

Сімвал мужнасці і славы

Ад узбярэжжа Ціхага акіяна да Эльбы сотні мільёнаў людзей—звыш адной трэці ўсяго чалавецтва—будуюць новае жыццё, кіруючыся непераможным вучэннем вялікага Леніна. У Леніне мільёны працоўных усіх краін бачаць свайго настаўніка, на яго класічных працах народныя масы вучыліся і вучацца, як трэба паспяхова змагацца супроць класавага ворага, як рыхтаваць умовы для канчатковай перамогі пролетарыята.

Уплыў Леніна—гэта ўплыў вялікай Комуністычнай партыі, у якой працоўныя капіталістычных краін бачаць такую партыю, вопыт якой дастойны пераймання. Пад кіраўніцтвам Комуністычнай партыі быў не толькі звергнут капіталізм і ўстаноўлена Совецкая ўлада—улада працоўных, але пабудован соцыялізм ў СССР. Працоўныя масы ўсяго свету на вопыце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, на вопыце пабудовы соцыялізма ў СССР пераканаліся ў глыбокай жыццёвай праўдзе неўміручых ідэй Леніна.

Выключна моцна ідэя неўміручасці Леніна выказана ў даргінскай песні:

Кто сказал, что умер Ленин?
Он живет!
В каждом новом поколенье живет,
В нашей юности цветенье живет,
В пролетарском единенье живет,
В революции всесветной живет,
В Конституции победной живет,
В нашей правде беззаветной живет,
В клятве Сталина бессмертной живет!

На шматлікіх мовах народы Совецкага Саюза складаюць аб Леніне песні, легенды, казкі. У народнай казцы «Ленінская праўда» расказваецца аб тым, як народ доўгія гады шукаў праўду і толькі ў Леніна знайшоў яе.

Другі народны майстра гаворыць, што Ленін «людей пробудил, как неслыханный гром, слабые сильными стали при нем». Пясняр гаворыць, што Ленін

Для отсталых, темных племен
Создал счастливый век.
Под мудрым взором его
Человеком стал человек.

З вялікай любоўю і цеплынёй гаворыць аб Леніне беларускі народ. Ленін і Сталін ва ўяўленні народа—людзі вялікага розуму, вялікай любві да працоўных. Яны заўсёды з народам, у іх няма іншых інтарэсаў, акрамя інтарэсаў народа.

Лепшыя словы і вобразы падбіраюць народныя майстры для выказвання мудрасці Леніна, яго сілы, вялікай прастаты і чалавечнасці. Ленін сваім вучэннем і дзейнасцю прынёс святло народам, ён, як сонца, абагрэў іх сэрцы, асвятліў ім шлях да шчаслівага жыцця, даў ім у рукі «залатыя шчасця ключы». У кожным слове выражана любоў да правадыра, як да самага блізкага і дарагога чалавека.

У творах, прысвечаных Леніну, народныя песняры і казачнікі гавораць аб велічы Леніна, аб яго самаахвярным служэнні справе рабочага класа, аб яго безмежнай любві да народа, аб сіле яго духа, велічы яго заслуг перад партыяй, народам, перад усім прагрэсіўным чалавецтвам.

Палымяныя мары народа аб шчасці, аб таржастве праўды, аб свабодзе знайшлі сваё ажыццяўленне ў нашу вялікую эпоху. Совецкая быль зрабілася цудоўней самай прыгожай казкі. Усе перамогі совецкага народа звязаны з імем Леніна. Народны пясняр Казахстана Джамбул гаворыць аб Леніне:

Бессмертен твой образ!
Ты жив в напряженной борьбе,
В огнях электричества, в чистом
сиянии стали
И в песнях народа, и в нашей
счастливой судьбе.

Імя Леніна—сімвал мужнасці, сімвал славы совецкага народа, заклік да новых гераічных спраў.

В. ЗАХАРАВА,
кандыдат філалагічных навук.

★ ★

Вывучаю ленінскія творы

Асновы марксісцка-ленінскай навукі я вывучаю ўжо другі год. Яшчэ на першым курсе я старанна канспектаваў першакрыніцы, часта выступаў на семінарах. Вынікам маёй працы была выдатная адзнака па гэтаму прадмету ў час летняй экзаменацыйнай сесіі. Мінулагодні вопыт работы над першакрыніцамі практыкую і ў бягучым годзе.

Залогам паспяховага вывучэння асноў марксізма-ленінізма з'яўляецца наведванне лекцый, на якіх я канспектую галоўныя палажэнні. Але гэтага мала. Нават пры самым уважлівым слуханні лекцый нельга глыбока засвоіць такую навуку, як марксізм-ленінізм.

Рыхтавацца да семінарскіх заняткаў я пачынаю за некалькі дзён да іх. Як правіла, кожны дзень уважліва прачытваю адзін з раздзелаў работы, асноўную думку якога запісваю ў спецыяльны сшытак. Так на працягу двух-трох дзён я маю магчымасць добра падрыхтавацца да семінара.

Чытаю не толькі абавязковую літаратуру, але і дадатковую, што дазваляе значна глыбей зразумець тое або іншае пытанне.

Добрасумленная падрыхтоўка да семінарскіх заняткаў значна палегчыць мне падрыхтоўку да экзаменаў па асновах марксізма-ленінізма.

В. МАКАРЭВІЧ,
студэнт II курса аддзялення журналістыкі.

У ЛЕНІНСКІЯ ДНІ

Наш універсітэт, які носіць імя вялікага Леніна, шырока адзначае 85-годдзе з дня нараджэння правадыра працоўных усяго свету. Партыйная арганізацыя сумесна з навуковай часткай і кафедрамі грамадскіх навук распрацавала план мерапрыемстваў па святкаванню ленінскіх дзён.

Адбыўся агульнаўніверсітэцкі вечар, прысвечаны В. І. Леніну. З дакладам «Вялікая жыццёсцвярджальная сіла ідэй ленінізма» выступіў прафесар т. Лушчыцкі.

У гэтыя дні праходзяць студэнцкія навуковыя канферэнцыі, на якіх чытаюцца даклады: «В. І. Ленін—вялікі арганізатар і правадыр Комуністычнай партыі Совецкага Саюза», «Ленін—стваральнік новай партыі—партыі соцыялістычнай рэволюцыі», «В. І. Ленін—заснавальнік першай ў свеце соцыялістычнай дзяржавы» і іншыя.

Вечары, прысвечаныя жыццю і дзейнасці вялікага Леніна, праходзяць на хімічным, фізіка-матэматычным і іншых факультэтах.

Партыйнае бюро універсітэта вылучыла дакладчыкаў для чытання дакладаў аб Леніне на прадпрыемствах і ўстановах горада.

ПАДАРУНАК

М. АРОЧКА

Я ўспамінаю свой калгас,
Зімовы вечар ціхі,
Калі сабраліся да нас
За працаю ткачыхі.
А іх занятак—не сакрэт,—
Усе вяскоўцы зналі:
Ткачыхі Леніна партрэт
Да позняй ночы ткалі.
Быў пад рукамі ў іх не шоўк,
А просты, каляровы,
Па густу выбраны ўток
І тонкая аснова.
Я назіраў, як з-пад рукі
Партрэт любімы тчэцца,
Праўдзівы і ва ўсім такі,
Які жыве ў іх сэрцах.
Ткачых калгасных пачуццё
Важней за ўток шаўковы.
Само шчаслівае жыццё
Для працы іх—аснова.
Прыгожа вытканы партрэт,
Нібы любві паруку,
Нядаўна я ў Маскве сустрэў
Між іншых падарункаў.
І я ўспомніў свой калгас,
Зімовы вечар ціхі,
Калі збіраліся да нас
Калгасныя ткачыхі.

В. И. ЛЕНИН

М. ГОРЬКИЙ

Мне следовало начать с Лондонского съезда, с тех дней, когда Владимир Ильич встал передо мною превосходно освещенный сомнениями и недоверием одних, явной враждой и даже ненавистью других.

Я и сейчас, вот, все еще хорошо вижу голые стены, смешной своим убожеством, деревянной церкви на окраине Лондона, стрельчатые окна небольшого, узкого зала, похожего на классную комнату бедной школы. Это здание напоминало церковь только извне, а внутри ее—полное отсутствие предметов культа, и даже невысокая кафедра проповедника помещалась не впереди, в глубине зала, а у входа в него, между двух дверей.

До этого года я не встречал Ленина, да и читал его не так много, как бы следовало. Но то, что удалось мне прочитать, а особенно восторженные рассказы товарищей, которые лично знали его, потянуло меня к нему с большой силой.

Когда нас познакомили, он, крепко стиснув мою руку, прощупывая меня зоркими глазами, заговорил тоном старого знакомого, шутливо:

— Это хорошо, что вы приехали! Вы, ведь, драки любите? Здесь будет большая драчка.

Я ожидал, что Ленин не таков. Мне чего-то нехватало в нем. Картавит и руки сунул куда-то под мышки, стоит фертом. И вообще, весь—как-то слишком прост, не чувствуется в нем ничего от «вождя». Я—литератор. Профессия обязывает меня подмечать мелочи, эта обязанность стала привычкой, иногда—уже надоедливой.

Когда меня «подводили» к Г. В. Плеханову, он стоял скрестив руки на груди и смотрел строго, скучновато, как смотрит утомленный своими обязанностями учитель еще на одного нового ученика. Он сказал мне весьма обычную фразу: «Я поклонник вашего таланта». Кроме этого он не сказал ничего, что моя память удержала бы. И на протяжении всего съезда ни у него, ни у меня не явилось желания поговорить «по душам».

А этот лысый, картавый, плотный, крепкий человек, потирая одною рукой сократовский лоб, дергая другою мою руку, ласково поблескивая удивительно живыми глазами, тотчас же заговорил о недостатках книги «Мать», оказалось, что он прочитал ее в рукописи, взятой у И. П. Ладыжникова. Я сказал, что торопился написать книгу, но—не успел объяснить почему торопился,—Ленин, утвердительно кивнув головой, сам объяснил это: очень хорошо, что я поспешил, книга—нужная, много рабочих участвовало в революционном движении несознательно, стихийно, и теперь они прочитают «Мать» с большой пользой для себя.

«Очень своевременная книга». Это был единственный, но крайне ценный для меня его комплимент. Затем он деловито осведомился, переводится ли «Мать» на иностранные языки, насколько испортила книгу русская и американская цензура, а узнав, что автора решено привлечь к суду, сначала—поморщился, а затем, вскинув голову, закрыв глаза, засмеялся каким-то необыкновенным смехом; смех его привлек рабочих, подошел, кажется, Фома Уральский и еще человека три.

Я был настроен очень празднично, я находился в среде трех сотен отборных партийцев, узнал, что они посланы на съезд полутораста тысячами организованных рабочих.

...Но вот поспешно взошел на кафедру Владимир Ильич, картаво произнес «товарищи». Мне показалось, что он плохо говорит, но уже через минуту я, как и все, был «поглощен» его речью. Первый раз слышал я, что о сложнейших вопросах политики можно говорить так просто. Этот не пытался сочинять красивые фразы, а подавал каждое слово на ладони, изумительно легко обнажая его точный смысл. Очень трудно передать необычное впечатление, которое он вызывал.

Его рука, протянутая вперед и немного поднятая вверх ладонь, которая как бы взвешивала каждое слово, отсеивая фразы противников, заменяя их вескими положениями, доказательствами права и долга рабочего класса итти своим путем, а не сзади и даже не рядом с либеральной буржуазией,—всё это было необыкновенно и говорилось им, Лениным, как-то не от себя, а, действительно, по воле истории. Слитность, законченность, прямота, и сила его речи, весь он на кафедре,—точно произведение классического искусства: всё есть и ничего лишнего, никаких украшений, а если они были—их не видно, они так же естественно необходимы, как два глаза на лице, пять пальцев на руке.

По счету времени он говорил меньше ораторов, которые выступали до него, а по впечатлению—значительно больше; не один я чувствовал это, сзади меня восторженно шептали:

— Густо говорит...

Так оно и было; каждый его довод развертывался сам собою, силою, заключенной в нем.

Меньшевики не стесняясь показывали, что речь Ленина неприятна им, а сам он—более, чем неприятен. Чем убедительнее он доказывал необходимость для партии подняться на высоту революционной теории для того, чтобы всесторонне проверить практику, тем озлобленнее прерывали его речь.

— Съезд не место для философии!

— Не учите нас, мы—не гимназисты!

Особенно старался кто-то рослый, бородатый, с лицом лавочника, он вскакивал со скамьи и, заикаясь, кричал:

— З-загово-орчики... в з-заговорчики играете! Б-бланкисты!

Одобрительно кивала головой Роза Люксембург; она очень хорошо сказала меньшевикам на одном из следующих заседаний:

— Вы не стоите на марксизме, а сидите, даже—лежите на нем.

Злой, горячий ветерок раздражения, иронии, ненависти гулял по залу, сотни глаз разнообразно освещали фигуру В. Ильича. Незаметно было, что враждебные выпады волнуют его, говорил он горячо, но веско, спокойно; через несколько дней я узнал, чего стоило ему это внешнее спокойствие. Было очень странно и обидно видеть, что вражду к нему возбуждает такая естественная мысль: только с высоты теории партия может ясно увидеть причины разногласий среди ее. У меня образовалось такое впечатление: каждый день съезда придает В. Ильичу всё новые и новые силы, делает его бодрее, уверенней, с каждым днем речи его звучат всё более твердо, и вся большевистская часть членов съезда настраивается решительнее, строже.

...Как-то пришел к нему и вижу: на столе лежит том «Войны и мира».

ПА СЛАЎНАМУ ШЛЯХУ ДА КОМУНІЗМА

★ ★

З НАТХНЕННЕМ І ЛЮБОЎЮ

— Тэмай сённяшняга семінара з'яўляецца паказ натхняючай і арганізуючай ролі Комуністычнай партыі ў барацьбе совецкага народа супраць фашысцкіх захопнікаў,— звярнуўся дацэнт Г. С. Маханёк да студэнтаў трэцяй групы II курса аддзялення матэматыкі.—Хто раскажа аб прычынах і характары другой сусветнай вайны?

Яўгені Царкоў упэўнена падняў руку, устаў з месца.

— Дазвольце мне...

Грыгорый Сцяпанавіч уважліва слухае, як Яўгені характарызуе міжнароднае становішча напярэдадні другой сусветнай вайны, аналізуе прычыны ўзнікнення ў Германіі фашызма.

— Владзімір Ільіч Ленін вучыў адрозніваць войны справядлівыя і захопніцкія. Вялікая Айчынная вайна Совецкага Саюза была вызваленчай вайной, справядлівай, а фашысцкая Германія вяла вайну агрэсіўную, захопніцкую,—заканчвае выступленне Царкоў.

— Матэрыял вы засвоілі нядрэнна,—ацэньвае адказ Г. С. Маханёк.—Але прычыны ўзнікнення другой сусветнай вайны вы так і не ўскрылі. Хто зробіць гэта?

Стараста групы Браніслава Ціхановіч напярэдадні семінара ўважліва прачытала работу В. І. Леніна «Імперыялізм, як вышэйшая стадыя капіталізма». І таму яна грунтоўна дапаўняе адказ Царкова:

— Войнаў нельга пазбавіцца, не пазбавіўшыся ад імперыялізма. Пагоня за звышпрыбыткам з'яўляецца прычынай узнікнення сусветных бойняў. Капіталісты шукаюць у іх выхаду з крызісаў, з загнівання і не знаходзяць, бо адзін выхад— соцыялістычная рэволюцыя.

Затым выступае Яўгені Ягела. Рыхтуючыся да семінара, ён праглядзеў III том «Гісторыі дыпламатыі», успомніў змест раманаў Н. Шпанава «Змоўшчыкі» і «Надпальшчыкі». Вось чаму ён прыводзіць многа фактаў, якія былі невядомы аднакурснікам. Свой адказ Яўгені ўвязвае з сучаснасцю:

— Згодна з парыжскімі пагадненнямі Заходняя Германія атрымала дазвол трымаць армію ў чатыры разы большую, чым гэта германскаму вермахту дазвалялася Версальскім дагаворам. Амерыкана-англійскія манапалісты імкнуцца адрадзіць фашызм. Але гэтага ім не ўдасца. Народы не дазволяць ім!

Група слухала Яўгенія з неаслабнай увагай. Адчувалася, што гэты юнак шмат ведае, расказвае не завучанае, а сваё, перадуманае.

Затым Г. С. Маханёк дадатна характарызуе адказы студэнтаў на першаму пытанню.

— Таварыш Ціхановіч права. Няць вызначаных В. І. Леніным прыкмет імперыялізма, адкрываюць нам вочы і на прычыны ўзнікнення другой сусветнай вайны.

На пытанню аб нападзе на СССР фашысцкай Германіі выступіла Галіна Ляшчук. Яна абдумана пераказала змест прамовы І. В. Сталіна ад 3 ліпеня 1941 года, падмацавала свае словы выказваннямі з ленінскага твора «Аб унутраняй і знешняй палітыцы рэспублікі».

Глыбокія веды паказаў на семінары Барыс Арван. Гаворачы аб разгроме фашыстаў пад Масквой, ён выкарыстаў многа дадатковых звестак. З падрабязнасцю Барыс вызначыў на карце лінію фронта, расказаў аб гераічных баях Совецкай Арміі.

Семінар, які прайшоў на другім курсе аддзялення матэматыкі, яскрава паказвае, з якой любоўю і натхненнем вывучаюць студэнты ўсеперамагаючую тэорыю марксізма-ленінізма.

А. МАЛЬДЗІС.

★ ★ ★

ТРЫУМФ ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫІ КУЛЬТУРНАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

22 красавіка ўсе совецкія людзі, усё прагрэсіўнае чалавецтва адзначае восемдзесят пяць год з дня нараджэння Владзіміра Ільіча Леніна—вялікага заснавальніка і правадыра Комуністычнай партыі і Совецкай дзяржавы, мудрага настаўніка працоўных усяго свету, геніяльнага тэарэтыка марксізма і вялікага арганізатара мас. Імя Леніна бясконца дорага і блізка працоўным усіх краін. Яно з'яўляецца ўсеперамагаючым сцягам мільёнаў. Ідэі Леніна—вялікія, вечна жывыя, яны асвятляюць шлях да соцыялізма і комунізма працоўным лагеру міру, дэмакратыі і соцыялізма, шлях да перамогі ўсім прыгнечаным народам зямлі.

Развіваючы рэволюцыйнае вучэнне Маркса—Энгельса ў новых гістарычных умовах, у эпоху імперыялізма і пролетарскіх рэволюцый, В. І. Ленін усебакова распрацаваў марксісцкую філасофію, палітычную эканомію, тэорыю навуковага соцыялізма і комунізма. Ленін узбагаціў марксісцкую навуку аб законах класавай барацьбы, стварыў цэласнае вучэнне аб дыктатуры пролетарыята і яе дзяржаўнай форме, аб Комуністычнай партыі; распрацаваў новую закончаную тэорыю соцыялістычнай рэволюцыі, абгрунтаваў магчымасць перамогі соцыялізма ў адной краіне. Ленін стварыў рэволюцыйную марксісцкую партыю, партыю новага тыпу, якая прывяла народы нашай краіны да сусветна-гістарычнай перамогі соцыялізма і з'яўляецца ўзорам для ўсіх сапраўды пролетарскіх партый, якія змагаюцца супроць эксплуататараў і прыгнятальнікаў.

В. І. Ленін даў навукова-абгрунтаваную праграму будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне, паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма, узброіў партыю, увесь совецкі народ яснай праграмай пераўтварэння эканамічна адсталай Расіі ў перадавую, магутную соцыялістычную дзяржаву. Гэта праграма прадугледжвала перш за ўсё соцыялістычную індустрыялізацыю краіны, развіццё цяжкай індустрыі і электрыфікацыю; ажыццяўленне на базе магутнай індустрыі соцыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі праз кааператыў. Адным з важнейшых састаўных звенняў ленінскай праграмы будаўніцтва ў СССР з'яўляецца ажыццяўленне культурнай рэволюцыі. У аснове ленінскага плана пабудовы соцыялізма і комунізма ў нашай краіне ляжыць ідэя непарушнага саюза рабочага класа і сялянства, які Владзімір Ільіч называў самай цудоўнай у свеце сілай.

Абапіраючыся на ленінскія ідэі, Комуністычная партыя выпрацавала мудрую палітыку будаўніцтва соцыялізма і комунізма і мабілізавала совецкі народ на правядзенне яе ў жыццё.

У СССР перамог соцыялізм. Разам з ажыццяўленнем індустрыялізацыі краіны, правядзеннем калектывізацыі сельскай гаспадаркі і стварэннем матэрыяльных асноў соцыялізма, Комуністычная партыя, выконваючы запаветы Леніна, праяўляла штодзённыя клопаты аб духоўным багацці совецкага грамадства. У нашай краіне была ажыццёўлена глыбокая культурная рэволюцыя.

Капіталізм прыгнятае працоўныя масы не толькі палітычна, эканамічна, але і духоўна, пазбаўляючы іх пладоў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія створаны працай народа. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя вызваліла магутныя духоўныя сілы народа, адкрыла яму шляхі да творчасці. «Раней,—пісаў В. І. Ленін,—увесь чалавечы розум, увесь яго геній тварыў толькі для таго, каб даць адным усе багацці тэхнікі і культуры, а другіх пазбавіць самага неабходнага—асветы і развіцця. Зараз-жа ўсе цуды тэхнікі, усе заваёвы культуры стануць усенародным багаццем». Якой бліскучай ілюстрацыяй правоты гэтых натхнёных слоў з'яўляецца наша сённяшняя сапраўднасць!

Культурная рэволюцыя, якую ажыццявіла партыя, ліквідавала супроцьлегласць паміж разумовай і фізічнай працай, зрабіла карэнны пералом у свядомасці мільёнаў людзей. Яна азначае разгром буржуазнай ідэалогіі, творчасць новай, соцыялістычнай культуры. Культурная рэволюцыя, як неад'емная частка соцыялістычнай рэволюцыі, назаўсёды пакончыла з культурнай адсталасцю мільёнаў працоўных нашай краіны. Былі створаны шматлікія кадры сапраўды народнай, соцыялістычнай інтэлігенцыі, якая заняла пачэснае месца ў барацьбе совецкага народа за пабудову комунізма.

Гіганцкі размах набыла ў нас народная асвета і вышэйшая адукацыя. Совецкі лад абудзіў у асяроддзі працоўных вялікую цягу да навукі і культуры. У нашай краіне на сённяшні дзень рознымі відамі вучобы ахоплена каля 60 мільёнаў чалавек.

Зараз па рашэнню XIX з'езда КПСС у СССР ажыццёўлен пераход ад сямігадовай да ўсеагульнай дзесяцігадовай адукацыі. Да канца 1955 года такі пераход будзе завершаны ў сталіцах саюзных рэспублік, у абласных і буйных прамысловых цэнтрах.

Каля трох мільёнаў чалавек навучаецца без адрыву ад вытворчасці ў спецыяльных, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах. Амаль столькі-ж юнакоў і дзяўчат набываюць кваліфікацыю ў тэхнікумах і ВНУ краіны.

Паставіўшы навуку на службу народу, Кастрычніцкая рэволюцыя, як і прадбачыў В. І. Ленін, забяспечыла спрыяючыя ўмовы для развіцця навукі, якіх яна ніколі не мела і не можа мець пры капіталізме. У нашай краіне бурна расцвітае навука. Яна з'яўляецца надзейным і верным памочнікам народа ў барацьбе за комунізм. Дзякуючы выдатным адкрыццям совецкіх вучоных, у СССР упершыню ў свеце вырашана і практычна ажыццёўлена задача выкарыстання найвялікшага адкрыцця чалавецтва—атамнай энергіі—у мірных мэтах, у мэтах стварэння матэрыяльных каштоўнасцей. Совецкія вучоныя дабіліся выдатных дасягненняў у галіне біялогіі, фізіялогіі, медыцыны, рэактыўнай тэхнікі, аўтаматыкі, тэлемеханікі, радыётэхнікі, хіміі і г. д. Адкрыцці совецкіх вучоных з'яўляюцца значным укладам у справу барацьбы нашага народа за комунізм.

Магутны культурны ўздым совецкага народа знаходзіць таксама яскравае выражэнне і ў вялікіх поспехах совецкай літаратуры і мастацтва. Масавасць, народнасць і высокая комуністычная ідэйнасць—характэрныя рысы і важнейшая асаблівасць нашай соцыялістычнай культуры.

Совецкі соцыялістычны грамадскі лад, мудрая ленінская нацыянальная палітыка, ажыццяўляемая Комуністычнай партыяй, прывяла да росквіту соцыялістычнай па зместу, нацыянальнай па форме культуры ўсіх раней прыгнечаных царызмам народаў. Яскравы прыклад таму— наша рэспубліка. Беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць, стварыў нацыянальную інтэлігенцыю, сваю багатую літаратуру, мастацтва. У Беларусі, якая не мела да рэволюцыі вышэйшай школы, працуе зараз Акадэмія навук са шматлікімі інстытутамі і лабараторыямі; каля 30 вышэйшых навучальных устаноў рыхтуюць высокакваліфікаваныя кадры для ўсіх галін народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі.

Адной з старэйшых і буйнейшых навучальных устаноў рэспублікі з'яўляецца Беларускі дзяржаўны універсітэт, які носіць імя найвялікшага правадыра чалавецтва, мудрага светача культуры Владзіміра Ільіча Леніна. За 35 год свайго існавання універсітэт выпусціў не адну сотню спецыялістаў, якія прынялі актыўны ўдзел у барацьбе за культурную рэволюцыю. Сярод выпускнікоў універсітэта—многія відненшыя вучоныя, пісьменнікі, паэты, заслужаныя настаўнікі.

Беларускі універсітэт імя В. І. Леніна—буйнейшая кузня нацыянальных кадраў. У яго сценах навучаецца разам з завочнікамі звыш 6 тысяч студэнтаў. На 47 кафедрах працуе больш 300 навуковых работнікаў, у тым ліку 25 прафесараў і дактароў навук.

Адзначаючы 85-годдзе з дня нараджэння вялікага Леніна, шматлікі калектыў нашага універсітэта мабілізоўвае ўсе свае намаганні для павышэння сваёй навуковай, вучэбнай і палітыка-выхаваўчай работы, для далейшага паляпшэння справы падрыхтоўкі кадраў высокай кваліфікацыі.

Вялікі Ленін даў совецкаму народу праграму комуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, праграму стварэння матэрыяльных і духоўных асноў комунізма. Ён вучыў, што комунізм вырастае з усямернага ўмацавання і развіцця асноў соцыялізма. Пры ажыццяўленні паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма важнейшае значэнне набывае комуністычнае выхаванне мас, усебаковае развіццё фізічных і разумовых здольнасцей усіх членаў грамадства, пераадольванне перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей, выхаванне ўсіх працоўных у духу комуністычных адносін да працы і да грамадскай уласнасці.

Кіруючыся мудрымі ідэямі вялікага Леніна, Комуністычная партыя ажыццяўляе магутны ўздым народнай гаспадаркі, культуры і на гэтай аснове—рост матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця працоўных нашай краіны. Яна паспяхова вядзе совецкі народ ленінскім шляхам да комунізма.

В. СІКОРСКІ,
кандыдат філасофскіх навук.

— Да, Толстой! Захотелось прочитать сцену охоты, да, вот, вспомнил, что надо написать товарищу. А читать—совершенно нет времени. Только сегодня ночью прочитал вашу книжку о Толстом.

Улыбаясь, прижмурив глаза, он с наслаждением вытянулся в кресле и, понизив голос, быстро продолжал:

— Какая глыба, а? Какой матерый человечище! Вот это, батенька, художник... И,—знаете, что еще изумительно? До этого графа подлинного мужика в литературе не было.

Потом, глядя на меня прищуренными глазками, спросил:

— Кого в Европе можно поставить рядом с ним?

Сам себе ответил:

— Некого.

И, потирая руки, засмеялся, довольный.

Я нередко подмечал в нем черту гордости русским искусством. Иногда эта черта казалась мне странно-чуждой Ленину и даже наивной, но потом я научился слышать в ней отзвук глубоко-скрытой, радостной любви к рабочему народу.

На Капри он, глядя, как осторожно рыбаки распутывают сети, изорванные и спутанные акулой, заметил:

— Наши работают бойчее.

А когда я выразил сомнение по этому поводу, он, не без досады, сказал:

— Гм-гм, а не забываете вы России, живя на этой шишке?

В. А. Десницкий-Строев сообщил мне, что однажды он ехал с Лениным по Швеции, в вагоне, и рассматривал немецкую монографию о Дюрере.

Немцы, соседи по купэ, его спросили, что это за книга. В дальнейшем оказалось, что они ничего не слышали о своем великом художнике. Это вызвало почти восторг у Ленина, и дважды, с гордостью, он сказал Десницкому:

— Они своих не знают, а мы знаем.

Как-то вечером, в Москве, на квартире Е. П. Пешковой, Ленин, слушая сонаты Бетховена в исполнении Исая Добровейн, сказал:

— Ничего не знаю лучше «Апассионаты», готов слушать ее каждый день. Изумительная, нечеловеческая музыка. Я всегда с гордостью, может быть, наивной думаю: вот какие чудеса могут делать люди!

И, прищурясь, усмехаясь, он прибавил невесело:

— Но часто слушать музыку не могу, действует на нервы, хочется милые глупости говорить и гладить по головкам людей, которые, живя в грязном аду, могут создавать такую красоту. А сегодня гладить по головке никого нельзя— руку откусят, и надобно бить по головкам, бить безжалостно, хотя мы, в идеале, против всякого насилия над людьми. Гм-гм,— должность адски трудная!

КОМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

Цікавыя мерапрыемствы забыты

— Пройдзем зараз у сталеліцейны цэх,—сказаў экскурсавод т. Нечынюк, і група студэнтаў накіравалася ўслед за ім. У гэтым цэху юнакі і дзяўчаты з вялікай цікавасцю глядзелі, як струмені полымя ўліваліся ў вялізныя катлы, а ўжо адтуль палымяная маса разлівалася ў шматлікія формачкі і паступова цямнела. Не ўсе адразу зразумелі, што гэта льецца метал.

Студэнты спынялі свае позіркі на людзях у цёмных акулярах з гумавымі пальчаткамі на руках, якія разлівалі метал так спрытна і ўмела, нібы мелі справу з вадой. Экскурсавод расказаў аб тым, што з гэтага металу адліваюць самыя рознастайныя дэталі, а потым дадаў, што сталеліцейны цэх з'яўляецца адным з перадавых на трактарным заводзе.

Многа цікавага ўбачылі студэнты ў зборачным цэху. Тут яны падрабязна азнаёміліся з працэсам зборкі трактара «Беларусь».

— Трактаразаводцы штодзённа выпускаюць некалькі дзесяткаў трактараў,—сказаў экскурсавод.— А дабіліся гэтага мы толькі таму, што кожны рабочы, якую-б работу ён не выконваў, працуе сумленна, з аганьком.

З вясёлым смехам і жартамі вярталіся студэнты дадому. Сённяшняя экскурсія ўсім так спадабалася, што многія выказалі жаданне наведаць і іншыя прадпрыемствы Мінска.

— Давайце ў наступны раз зробім экскурсію на кандытарскую фабрыку,—прапанавала Аня Корсак. Усе аднакурснікі падтрымалі яе.

На жаль, такіх мерапрыемстваў на I курсе аддзялення рускай мовы і літаратуры праводзіцца мала. Яшчэ ў пачатку сакавіка было запланавана правесці гутарку на тэму «Аб сусветным тыдні моладзі» ў трэцяй групе. Але такая цікавая гутарка і на сённяшні дзень не праведзена толькі таму, што Алег Шабельскі, якому было даручана падрыхтаваць даклад, не знайшоў часу для гэтага. Сістэматычна не выконвае комсамольскіх даручэнняў студэнтка Патаповіч. Яна адмовілася нават зрабіць палітінфармацыю ў сваёй групе, спаслаўшыся на тое, што ёй не пад сілу такое даручэнне.

Студэнтку Навіцкую нікольі не цікавіць тое, што робіцца на курсе. Яна не толькі адмаўляецца выканаць якое-небудзь даручэнне, але наогул лічыць лішнім праслухаць палітінфармацыю, даклад, схадзіць з групай у кіно або тэатр. Амаль такога-жа прынцыпу прытрымліваюцца Гарачун і Жукоўская.

Гэтыя факты сведчаць аб тым, што на першым курсе няма згуртаванага комсамольскага калектыву. Некаторыя студэнты ўхіляюцца ад выканання даручэнняў, а комсамольскае бюро не прымае канкрэтных мер, каб выправіць такое становішча.

Не ўдзяляе першакурснікам належнай увагі і комсамольскае бюро факультэта. Праўда, член бюро т. Клімаў зрэдку бывае на першым курсе, але ўся яго дапамога абмяжоўваецца... праверкай планаў работы комсамольскіх груп, хаця комсамольскае бюро факультэта заклікана штодзённа і канкрэтна кіраваць работай курсавых арганізацый.

Нельга абвінавачваць комсоргаў курса Шалаеву, Сокалаву, Грышачкіну, што яны дрэнна працуюць. Наадварот, комсоргі імкнуцца як мага лепш будаваць сваю работу, але ім падчас нехапае ўмення, яны не ведаюць, як паступіць з тымі комсамольцамі, якія адмаўляюцца выконваць даручэнні, адрываюцца ад калектыву.

Ул. СКАПА.

Па старонках альманаха „Творчасць журналіста“

Перад намі—новы, сёмы нумар альманаха «Творчасць журналіста». Каля дваццаці маладых аўтараў прадстаўлены ў ім сваімі творамі. Вы сустракаеце тут верш і апавяданне, нарыс і замалёўку, рэцэнзію і ўрыўкі з манаграфіі. З асаблівай радасцю знаёміцеся з творчасцю першакурснікаў, якім альманах адвёў значнае месца.

З усіх пяці раздзелаў альманаха найлепшае ўражанне пакідае раздзел паэзіі. Тут вы чытаеце новыя вершы А. Вярцінскага, Г. Мохарта, С. Ляпесіна. З добрымі перакладамі на беларускую мову твораў Т. Г. Шэўчэнкі выступіў П. Міська.

Радуюць сваёй непасрэднасцю, тонкім лірычным настроем вершы А. Вярцінскага. Маладому паэту нядрэнна ўдаецца апісанне летняй ночы напярэдадні жніва, той затоенай радасці, што прыносяць з сабой першыя дні вясны і кахання. У паэзіі А. Вярцінскага трэба адзначыць яе канкрэтнасць, уменне паэта тонка падкрэсліць паэтычную думку трапнай дэталлю. Але ў радзе вершаў аб прыродзе аўтару не хапае гэтай канкрэтнасці і таму атрымліваецца павярхоўнае, а часамі і неправдападобнае апісанне.

Г. Мохарт, знайшоўшы часам для верша цікавую думку, не ў поўнай меры клапоціцца аб яе раскрыцці. Ад яго паэзіі часта вее літаратурнічынай, а не нашым сённяшнім днём. Асабліва падкрэсліваюць гэта некаторыя паэтычныя вобразы і параўнанні (напрыклад, «туманы кудзелямі спавілі паплавы»).

Аб вершах С. Ляпесіна можна гаварыць толькі як аб першых спробах маладога аўтара. Пачынаючаму паэту трэба знаходзіць нешта новае, свежае, а не перапяваць старое. Між тым, С. Ляпесін спяшаецца ўжо аб'ядноўваць свае вершы ў нізкі.

Трэба кінуць папрок рэдкалегіі альманаха за тое, што яна непатрабавальна аднеслася да вершаў здольнага маладога паэта Г. Бураўкіна, змясціўшы на старонках нумару вершы «Вячэрні Полацк» і«Дзвіна», якія ніяк не характарызуюць аўтара.

Асабліва не пашанцавала альманаху з апавяданнямі. І што характэрна для ўсіх празаікаў—гэта нявменне правільна размеркаваць матэрыял у сюжэтнай схеме. Таму і прышлося Е. Коршукаву ў апавяданні «Сталасць» так часта змяняць дзеянне. Нарастанне канфлікту, барацьбы аўтар перадае праз думкі свайго героя. Ад гэтага губляецца яскравасць карціны, і апавяданне не робіць на нас асаблівага ўражання. Аўтару варта было-б зрабіць і некаторае «скарачэнне штатаў» герояў, частка якіх не абумоўлена ў апавяданні яго ўнутраным дзеяннем.

Чыстая выпадковасць ляжыць у аснове апавядання Е. Арцёма «Чорныя косы». Справа ў тым, што два юнакі—студэнты—амаль адначасова закахаліся. Калі кожны з іх апісвае партрэт дзяўчыны, якою ён захапіўся, здаецца, што гэта адна і тая-ж прыгажуння. Але на іх шчасце хутка высвятляецца, што гэта дзве розныя дзяўчыны, хаця і вельмі нагадваючыя адна другую.

Калі ў разгледжаных апавяданнях мы сустракаліся з няўменнем пабудаваць сюжэт або пакласці ў аснову яго рэальныя факты, то ў «Старым паромшчыку» О. Фомчанкі зусім не адчуваецца ні ўласнай тэмы, ні спробы па-новаму яе вырашыць.

Асноўнага героя, старога дзядулю, аўтар прымушае «сморкаться в салфетку» (?). І яшчэ больш крыўдна становіцца, калі дзед, дзеля памя... вяжа на вузельчыкі. Мова а... дання перасыпана ўсялякімі літаратурнымі ўпрыгожваннямі. Вось адзін з прыкладаў апісання аўтарам навальніцы: «Удары грома нарастали, крепли молнии в небесном горне (?) и в грозном грохоте рыдающими отголосками (?) метался ветер. Раздирая в клочья непогодь, куда-то на край земли неудержимо рвались огненные стрелы...»

Больш свежа гучыць голас першакурсніцы Н. Няхай. У яе апавяданні «Заложніца» ёсць спроба індывідуалізіраваць мову дзяцей. Але сама сюжэтная схема нагадвае часамі «Баладу аб чатырох заложніках» А. Куляшова.

З цікавасцю сустрэў чытач замалёўку А. Луніна «Як ствараў... «Вішнёвы сад» на універсітэцкай сцэне». Мова замалёўкі жывая, разнастайная, яна добра перадае напружанне дзеяння, барацьбу калектыва за стварэнне цікавага спектакля.

Радуе некаторымі трапнымі назіраннямі і заўвагамі артыкул В. Мацкевіча «Вобраз журналіста ў творах совецкай літаратуры.» Але артыкул пабудован на простым пераліку твораў, у ім не поўнасцю раскрыта тэма.

Рэдкалегіі ў далейшым трэба быць больш патрабавальнай да матэрыялаў, якія мяркуецца змясціць на старонках альманаха, больш клапаціцца аб іх жанравай рознастайнасці.

А. КАСТУСЕВІЧ.

НАША НАДЗЁННАЯ ЗАДАЧА

Нашай краіне патрэбны ўсебакова адукаваныя, высокакваліфікаваныя людзі, здольныя выхоўваць падрастаючае пакаленне ў комуністычным духу. Таму комсамольскае бюро нашага аддзялення ўдзяляе вялікую ўвагу вучобе і дысцыпліне комсамольцаў.

Вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі гавораць аб тым, што бюро аддзялення, курсавыя комсамольскія арганізацыі палепшылі кантроль за вучобай студэнтаў. Значна павысілася паспяховасць. Студэнты IV і V курсаў здалі ўсе экзамены на «добра» і «выдатна». На першым курсе 30 студэнтаў здалі экзамены толькі на «выдатна». Але побач з гэтым некаторыя студэнты выявілі ў час экзаменаў няведанне элементарных пытанняў з праграмнага матэрыялу.

Ёсць выпадкі парушэння комсамольскай дысцыпліны асобнымі студэнтамі. Комсамольскі сход вынес студэнтам Чэнсік (I курс) і Зуеман (III курс) за страту комсамольскіх білетаў суровыя вымовы.

Комсамольскім арганізацыям курсаў патрэбна глыбей вывучаць жыццё студэнтаў і яшчэ больш удзяляць увагі барацьбе з праяўленнямі недысцыплінаванасці з боку студэнтаў не толькі ў сценах універсітэта, але і ў другіх грамадскіх месцах.

Мала змен адбылося ў рабоце студэнцкага навуковага таварыства. Навукова-даследчая работа да гэтага часу вядзецца на нізкім узроўні. Такія гурткі, як матэматычнага аналізу (кіраўнік дацэнт т. Родаў), аналітычнай геаметрыі (кіраўнік дацэнт т. Тутаеў) і дыферэнцыяльнай геаметрыі (кіраўнік дацэнт т. Нахімоўская) у большасці выпадкаў сваю работу абмяжоўваюць рашэннем задач. Зразумела, гэта не выклікае цікавасці ў студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў рабоце гурткоў.

Аб тым, што работа навуковых гурткоў выдзецца дрэнна, гаворыць і той факт, што аддзяленне фізікі на агляд вылучыла значна больш навукова-даследчых работ, чым аддзяленне матэматыкі. Прафесар т. Мышкіс раз у тыдзень чытае лекцыі для жадаючых займацца навукова-даследчай работай, але гэта чамусьці не прынесла паляпшэння работы гурткоў.

У першым семестры дрэнна ішла справа з развіццём мастацкай самадзейнасці. Зараз гурткі мастацкай самадзейнасці актывізавалі сваю работу. У іх рэпертуары маюцца самыя рознастайныя нумары: мастацкае чытанне, песні, танцы. і інш.

Вялікую работу вядзе комсамольскае бюро ў арганізацыі спартыўнай дзейнасці на аддзяленні. Рэгулярна праводзіліся лёгкаатлетычныя спаборніцтвы паміж курсамі ў зімовых умовах, стралковыя спаборніцтвы, на якіх стралкі нашага аддзялення занялі адно з першых месц. На II курсе створан гурток па вывучэнню ігры ў шахматы. Аднак нядаўна прайшоўшыя спаборніцтвы паказалі, што ў нас са спортам не ўсё яшчэ добра: спартсмены фізмата занялі прадапошняе месца. На сумесным пасяджэнні комсамольскіх бюро аддзялення матэматыкі і фізікі намечаны канкрэтныя меры, накіраваныя на паляпшэнне фізкультурнай работы на факультэце.

Хочацца адзначыць, што ў жыцці нашай комсамольскай арганізацыі недастаткова ўдзельнічаюць выкладчыкі. Яны амаль не цікавяцца нашай работай. Акрамя прафесара т. Мышкіса на сходах комсамольскай арганізацыі аддзялення нікога не бывае. Не наладжана цесная сувязь паміж групоргамі курсаў і выкладчыкамі, якія замацаваны за пэўнымі курсамі.

Комсамольскае бюро аддзялення павінна ўдзяляць зараз асаблівую ўвагу жыццю комсамольскіх арганізацый першага курса. Неабходна дапамагчы першакурснікам навучыцца самастойна працаваць з кнігай, глыбока засвойваць праграмны матэрыял, правільна планаваць свой час. Гэта ім дапаможа паспяхова здаць залікі і экзамены.

Многія недахопы ў нашай рабоце тлумачацца слабай дзейнасцю комсамольскіх арганізацый курсаў. Іменна яны павінны зрабіцца цэнтрам палітыка-выхаваўчай работы. Аднак работа на многіх курсах усё яшчэ не аднавядае ўзросшым патрабаванням. Узняць работу комсамольскіх арганізацый курсаў на належную вышыню—наша бліжэйшая задача ў бягучым годзе.

Н. АНІСІМАЎ,
сакратар комсамольскага бюро аддзялення матэматыкі.

СЕЗОН АДКРЫТ!

Адбылося адкрыццё летняга спартыўнага сезону лёгкаатлетамі ДСТ «Навука». У спаборніцтвах удзельнічалі каманды універсітэта, лесатэхнічнага, народнагаспадарчага і політэхнічнага інстытутаў.

Каманда універсітэта падышла да гэтых спаборніцтваў з добрымі паказчыкамі па адных відах спорту і з дрэннымі—па другіх. Узрасло майстэрства нашых спрынцераў. Уладзімір Ціток, напрыклад, прабег 60 метраў за 7,5 секунды, заняўшы першае месца на гэтай дыстанцыі. У Ціткa ёсць усе магчымасці летам на 100-метровай дыстанцыі паказаць час не больш 11,0 секунды. Добра паказалі сябе і нашы жанчыны на гэтай дыстанцыі.

Зусім дрэнныя вынікі паказалі мужчыны і жанчыны ў штурханні ядра. Акрамя Жунінай, якая ў гэтых спаборніцтвах устанавіла новы рэкорд універсітэта—10,36 метра, астатнія топчуцца на адным месцы. Творчага росту, паляпшэння якасці мы да гэтага часу ўсё яшчэ не бачым. Гэта тлумачыцца часткова і тым, што некаторыя фізічна моцныя спартсмены (Васілеўскі, Камінскі) спынілі заняткі ў секцыі. Слабыя вынікі былі ў спартсменаў універсітэта і па скачках у вышыню і даўжыню. Зусім няма замены такім здольным спартсменам, як А. Паўлючэнка, Б. Хлынцоў і А. Хоміч, ды і тыя трэніруюцца стыхійна, калі ім уздумаецца.

Значна ўплывае на рост маладых спартсменаў адсутнасць належных умоў для заняткаў. Няма ні гаравых дарожак, ні ям з пяском. Заняткі праводзяцца ў цеснай зале. Спартыўная грамадскасць універсітэта з большай стараннасцю павінна ўзяцца за пабудову ўласнага стадыёна, які-б садзейнічаў заняткам лёгкаатлетаў.

Трэнерскаму саставу патрэбна хутчэй ўзяцца за вышукванне здольных спартсменаў і прыцягванне іх у секцыі.

Вынікі прайшоўшых спаборніцтваў паказалі, што лёгкаатлеты універсітэта ў прадстаячым спартыўным сезоне змогуць дабіцца добрых паказчыкаў. Але для гэтага трэба дабіцца большай актыўнасці ў правядзенні заняткаў. Трэба прыцягнуць да сістэматычных заняткаў студэнтаў, якія раней мелі добрыя вынікі (Г. Васілеўскі, Т. Гарохава, Р. Ярымовіч, Грышунін, Гулякевіч і другія). Нядрэнна-б было, каб кафедра фізкультуры і спорту разгледзела спартыўныя перспектывы спартсменаў, якія займаюцца ў некалькіх секцыях, каб дапамагчы ім знайсці той від спорту, у якім яны прынясуць больш карысці. Добра было-б праводзіць спаборніцтвы ўнутры секцый, дзе-б спартсмены адпрацоўвалі тэхніку і тактыку спартыўнага майстэрства.

А. УХАНАЎ.

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА.

АТ 01278 Мінск, друкарня Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна. Тыраж 1000 экз. Зак. 238.